Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (97), 2016

*УДК 947.6 “1648-1651” “364”*

# Тэрор як форма барацьбы ў казацка-сялянскай вайне 1648–1651 гадоў на Беларусі

С.А. Чаропка

Даследуецца пытанне аб ужыванні тэрору варагуючымі дзяржаўным і паўстанцкім бакамі падчас казацка-сялянскай вайны, якая разгарнулася на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў 1648–1651 гг. У выніку даследавання ўстаноўлена, што абодва бакі шырока ўжывалі арганізаваны гвалт для запалохвання насельніцтва з мэтаю ўсталявання кантролю за пэўнай тэрыторыяй. Аб’ектам гвалту з боку паўстанцаў з’яўляліся прадстаўнікі ўсіх станаў рыма-каталіцкай і грэка-каталіцкай канфесій, а таксама яўрэйскае насельніцтва. Ахвярамі тэрору з дзяржаўнага боку з’яўляліся пераважна сяляне і мяшчане праваслаўнай канфесіі. Вынікам гэтай палітыкі сталі сур’ёзныя разбурэнні і дэмаграфічныя страты сярод усіх пластоў грамадства Вялікага Княства Літоўскага.
**Ключавыя словы:** Вялікае Княства Літоўскае, казацка-сялянская вайна, тэрор, гвалт, каталіцтва, уніяцтва, праваслаўе, шляхта, сялянства, мяшчанства, казакі.

The question of the use of terror by rival parties during the war Cossacks and Peasants against the Government that took place on the territory of present-day Belarus during the period from 1648 to 1651 BC is investigated. As a result of the carried out researches it has been established that both sides actively used organized violence to terrorize the local population with a view to establishing control over a certain territory. The objects of violence by insurgents were representatives of all the states of the Roman Catholic and Greek Catholic faiths, as well as the Jewish population. Victims of terror by the State Army were mostly peasants and townspeople of the Orthodox religion. The results of this policy have become serious destruction and population loss among all layers of the population of the Grand Duchy of Lithuania.
**Keywords:** Grand Duchy of Lithuania, Cossack and Peasant war, terror, violence, Catholicism, the Greek Catholic Church, orthodoxy, nobility, peasantry, petty bourgeoisie, Cossacks.

Казацка-сялянская вайна, якая разгарнулася на землях Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (ВКЛ) у 1648–1651 гг., адыграла значную ролю ў далейшым палітычным і сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх зямель. Гэтая вайна стала прыкладам самай маштабнай у айчыннай гісторыі адкрытай узброенай барацьбы сялянства і мяшчанства Літоўска-Рускай дзяржавы супраць этнаканфесійнай палітыкі кіроўных колаў Рэчы Паспалітай і сацыяльнай палітыкі ў цэлым. Нягледзячы на тое, што пытанне казацка-сялянскай вайны ўжо з’яўлялася прадметам даследвавання беларускіх, польскіх, украінскіх і расійскіх даследчыкаў, аднак асобныя яе фрагменты яшчэ маюць патэнцыял да далейшага даследавання [1]. Адным з такіх аспектаў з’яўляецца пытанне аб ужыванні тэрору варагуючымі бакамі ў адносінах да сваіх праціўнікаў.

Вайна стала наступствам шэрагу этнічных, канфесійных, эканамічных і палітычных супярэчнасцей, якія зліліся да сярэдзіны XVII ст. ў адзіны коплекс і падзялілі грамадства ВКЛ на два супрацьлеглыя лагеры. Да першага лагера можна аднесці магнатэрыю, каталіцкае і ўніяцкае духавенства, сярэднюю і дробную шляхту, прычым не толькі каталіцкую або ўніяцкую, але і дызуніцкую, а таксама прадстаўнікоў «люду паспалітага», што ўжо навярнуліся да уніі. Дарэчы, аб маштабах распаўсюджання царкоўнай уніі ў ВКЛ сведчыць заўвага сучаснікаў казацка-сялянскай вайны, якія адзначалі, што да сярэдзіны XVII ст. «унія у Литві … почала гору брати» [2, с. 51]. Да гэтага ж лагера належыць і яўрэйскае насельніцтва Літвы і Русі, частка якога заняла ў сацыяльнай стратыфікацыі месца паміж землеўласнікамі і землекарыстальнікамі, стаўшы ўвасабленнем эксплуатацыі ніжэйшых пластоў насельніцтва. Удзельнік казацка-сялянскай вайны, таварыш панцырнай харугвы Лось, у сваіх успамінах выказвае меркаванне, што «казацкай вайны прычынай быў празмерны прыціск ад паноў рускіх, настолькі вялікі, што дзяцей ахрысціць неможна было без дазволу яўрэяў-арэндатараў» [3, с. 2].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Другі лагер склалі масы рускага сялянства і мяшчанства, а таксама частка шляхты, якія не ўспрынялі царкоўнай уніі і казакі-запарожцы, якія паходзілі з рускіх зямель ВКЛ. Менавіта гэтыя пласты насельніцтва адкрыта выступілі супраць сацыяльнага прыгнёту, якое супала з этнаканфесійным распластаваннем на Літве, Русі і ў кароннай Украіне. Гэтае расслаенне было абумоўлена паступовым аддаленнем мясцовай эліты ад тутэйшага «паспольства», што было звязана з працэсам канфесійнай і моўнай канверсіі, якая паступова прыводзіла да асіміляцыі рускай шляхты і часткі мяшчанства ВКЛ [4, с. 82–83]. Унія «рускай» царквы Рэчы Паспалітай, спробы яе гвалтоўнага распаўсюджання ў першай чвэрці XVII ст. абвастрылі рэлігійнае пытанне, а поспехі прыхільнікаў царкоўнай уніі на Літве і Русі, нягледзячы на адсутнасць падтрымкі і нават неадназначнае стаўленне да яе з боку каралеўскай улады ў 30–40-х гг. XVII ст., у значнай меры паспрыялі абвастрэнню міжканфесійных адносін сярод рускага насельніцтва ВКЛ.

Трэба адзначыць, што ў прадстаўленым артыкуле пад тэрмінам «русь» або «рускія» маецца на ўвазе ўсходнеславянскае насельніцтва ВКЛ, якое ў навуковай літаратуры прынята называць старабеларускай народнасцю. Рускае насельніцтва ВКЛ стала продкам сфарміраванай пазней беларускай нацыі і не мае дачынення да рускага насельніцтва Рускай дзяржавы, якое стала продкам сучаснай рускай нацыі. Пад «рускімі» землямі ВКЛ разумеюцца землі, на якіх у XVII ст. пражывала пераважна рускае насельніцтва, якія зараз у асноўным уваходзяць у склад Рэспублікі Беларусь. Адзначым, што нягледзячы на супадзенне этноніма, рускае насельніцтва Літоўска-Рускай дзяржавы і рускія Расійскай дзяржавы ў XVII ст. належалі хаця і да родасных, але ўжо асобных этнасаў, што праяўлялася ў наяўнасці розных моў, рознай канфесійнай (уніяты) і царкоўнай (рознасць царкоўнай юрысдыкцыі і абраднасці ў праваслаўнага насельніцтва ВКЛ і Расіі) прыналежнасці, асобных гістарычных шляхах, якія яны прайшлі з XIII–XIV ст. Выбар тэрміну «рускі», «рускія землі» ў адносінах да старабеларускага насельніцтва і беларускіх у сучасным разуменні зямель былога ВКЛ абумоўлены імкненнем аўтара да максімальнага выкарыстання прынцыпаў канкрэтнасці і апоры на гістарычныя крыніцы, якія дакладна паказваюць этнічную і геаграфічную тэрміналогію, якой аперыравалі сучаснікі падзей.

У ходзе вайны, якая на працягу трох год з 1648 па 1651 гг. ахапіла значную частку ВКЛ, кожны з варагуючых бакоў імкнуўся ўзмацніць свае пазіцыі, шырока ўжываючы для гэтага арганізаваны гвалт – тэрор. Уварванне казакоў у Літоўскую Русь і хуткі захоп імі Палесся паклаў пачатак «казацкаму тэрору» – дзікаму і жудаснаму вынішчэнню сваіх праціўнікаў. Ахвярамі казакоў сталі «шляхта, слуги замковія, жиди й уряди міскіе», таксама іх жонкі і дзеці, каталіцкае і ўніяцкае духавенства. «Рідкій в той кріві на тот час рук своїх не умочил», – адзначае сучаснік [2, с. 52]. У Гомелі, у адным з першых беларускіх гарадоў, дзе замацаваліся казакі, яны «побили Жидовъ человѣкъ восемьсотъ, съ женами и дѣтми болши дву тысячь, да тутъ же побили Ляховъ съ щестьсотъ человѣкъ» [5, с. 227]. Пры гэтым варта адзначыць, што пад вызначэнне «ляхі» трапляюць не столькі этнічныя палякі, колькі мясцовая шляхта каталіцкай канфесіі. Асабліва жорстка казакі разам з паўстаўшымі сялянамі і мяшчанамі вынішчалі яўрэяў, якіх яны «сталі біць палкамі для таго, каб яны адразу не памерлі» [6, с. 164]. Іншая яўрэйская хроніка паведамляе, што ў Гомелі было забіта 1500 яўрэяў, якіх выдалі казакам «паны» [7, с. 187]. Такая жорсткасць казакоў была ініцыіравана іх лідарам – Багданам Хмяльніцім, які, па звестках расійскіх ваявод, «и урядниковъ, и державцовъ, и Поляковъ и Жидовъ велелъ побивать» [5, с. 211]. Падобны лёс спасціг жыхароў іншых гарадоў Палесся і Падняпроўя, захопленых казакамі. «Ляховъ і Жидовъ побивали безъ милости» ў Рэчыцы, Мазыры, Бярэсці (Брэсце), Старадубе [5, с. 283–284]. «Бресть Литовскую разорили до основанья, Поляковъ и Жидовъ и женъ ихъ и детей побили безъ остатку, хоромы и стены каменные розломали и розметали безъ остатку» [5, с. 247]. Яўрэйскія храністы адзначаюць, што ў Брэсце нельга было знайсці месца, дзе б не ляжалі трупы забітых [7, с. 189]. Пасля прыходу казакоў у гэты павятовы цэнтр, яўрэі «падпалі пад жорсткія катаванні; жанчыны і малыя дзеці былі перабіты, свяцілішчы спустошаны, дамы ўсе разбураны цалкам» [6, с. 165]. Калі літоўскае войска вызваліла горад, перад жаўнерамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

паўстала наступная карціна: «Бресть Литовская разорена жъ: на рынку лавокъ деревяныхъ и каменыхъ нетъ ни одной, и во всехъ дворехъ въ воротахъ, и въ хоромехъ двери и лавки и окна выломаны, ни одного двора целого нетъ, и Жиды все побиты» [5, с. 297]. У руіны казакамі быў пераўтвораны Кобрын [8, с. 70], [2, с. 53]. Казацкія загоны, якія амаль бесперашкодна распаўсюдзіліся па Палессі і Падняпроўі знішчалі цэлыя вёскі. «Черкасы … были Быхова города въ уезде и высекли село, и пошли назадъ къ Белой Церкви», – адзначае расійскі інфарматар [5, с. 229]. Вялікая колькасць яўрэяў была знішчана казакамі ў Брагіне [9, с. 112].

Падзенне Пінска 26 кастрычніка 1648 г. у выніку змовы мяшчан з казакамі стала апагеем «беларускай жакерыі» 1648–1651 гг. Паўстанцы і казакі сумесна «касцёлы Божыя рабавалі, нападалі …на дамы шляхецкія» [10, с. 34]. Рэктар Пінскага езуіцкага калегіюма ксёндз Станіслаў Тамашэўскі абвінавачваў казакоў і жыхароў Пінска ў тым, што яны «стан шляхецкі і духоўны забівалі, мардавалі, целы са склепаў выцягвалі і ў касцёле айцоў езуітаў вялікія гвалты зрабілі, абразы пасеклі, вокны разбілі, касцёл ў пыл пераўтварылі, целы са склепаў з трунаў вынімаючы выкідалі», аднак гэтым яны не задаволіліся і ўрэшце спалілі касцёл і калегіюм [11, с. 383–384]. Пры тым пагромшчыкі пераследвалі не толькі палітычныя, але і ўласныя матэрыяльныя мэты. Побач з варварскім знішчэннем усяго, што была звязана з «заходнім светам» і шляхтаю, казакі актыўна прыўлашчвалі нарабаваную маёмасць. «Самавідзец» адначае, што казакі добра «збогатилися шарпаниною добр шляхецких и жидовских и иніх людей» [2, с. 57]. У Пінску казакі разам з мяшчанамі разрабавалі ўсе залатыя і срэбраныя ўпрыгожванні з касцёла, а таксама з фальваркаў, якія належалі касцёлу і калегіюму каля Пінска, аж да катлоў і начыння [11, с. 383–384]. Што да яўрэяў Пінска, дык «калі непрыяцель прыйшоў у горад, ён злітаваўся толькі над праваслаўнымі, а мноства бедных і яўрэяў і яўрэяў-жабракоў, якія не здолелі з прычыны недахопу сродкаў уцякчы, былі знішчаны самымі пакутніцкімі спосабамі» [6, с. 165]. Паводле яўрэйскіх хронік менавіта ў Брэсце і Пінску была найбольшая колькасць ахвяр казакоў з ліку яўрэяў. Большасць забітых казакамі яўрэяў належала да ніжэйшых пластоў яўрэйскага грамадства, бо заможныя прадстаўнікі гэтай этнічнай меншасці са «св. абшчын Слуцк, Пінск і Брэст-Літоўскі ўцякалі: часткова ў Вялікую Польшчу, а часткова ў горад Данцыг, што ля мора за Віслай», у гарадах жа засталіся пераважна жабракі [9, с. 112].

Знішчаючы яўрэяў, шляхту, каталіцкае і ўніяцкае духавенства, казакі, аднак, не чапалі мясцовага сялянства і мяшчан-дызунітаў. Крыніцы поўняцца звесткамі, што казакі «секли Поляковъ и Жидовъ, а Белорусцевъ никого не секли», «те Черкасы ходятъ войною въ Литовской земле и побиваютъ Ляховъ и Жидовъ, а Белорусцевъ не побиваютъ» [5, сс. 217, 239–240]. Гэтае лагоднае стаўленне казакоў да ніжэйшых пластоў рускага насельніцтва ў спалучэнні з антыфеадальнай барацьбой, агорнутай ў рэлігійную афарбоўку, спрыяла стварэнню іміджу казакоў у вачах мясцовага «люду паспалітага» як барацьбітоў за веру: «Запорожскія Черкасі бьются съ Ляхи за веру» [5, с. 227]. Этнаканфесійная блізасць казакоў і жыхароў Літоўскай Русі, адзінства сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем, абумовіла падтрымку казацкага руху з боку ніжэйшых пластоў рускага насельніцтва ВКЛ. Да казацкіх загонаў сталі далучацца мясцовыя сяляне і мяшчане, пачалі ўзнікаць атрады, якія дзейнічалі разам з казакамі, але абмяжоўваліся сваім рэгіёнам. Такія атрады ўзніклі ў Рэчыцы, Пінску, Мазыры, Давыд-Гарадку і іншых гарадах Палесся [12, с. 103–106], [13]. Такім чынам, разам з уварваннем украінскіх казакоў у ВКЛ, тут пачалося грандыёзнае сялянска-мяшчанскае антыфеадальнае паўстанне, а барацьба паміж варагуючымі бакамі набыла рысы грамадзянскай вайны.

У Старадубскім павеце Смаленскага ваяводства мясцовыя сяляне, перабіўшы сваіх паноў, уцяклі за мяжу Расійскай дзяржавы [5, с. 227]. Мясцовыя паўстанцы разам з казакамі прымалі актыўны ўдзел у спусташэнні і рабаванні касцёлаў, кляштараў і шляхецкай маёмасці. С. Тамашэўскі абвінавачвае мяшчан Пінска ў тым, што яны «здраду робячы супраць Рэчы Паспалітай, мяцеж падняўшы, учыніўшы змову з казакамі мяцежнікамі, пасылаючы ім на дапамогу грошы … казакоў мяцежнікаў украінскіх да павету Пінскага і да самога места Пінска некалькі тысяч направодзячы і злучыўшыся з тымі гультаямі, выступаючы не толькі супраць Рэчы Паспалітай, але і супраць самога Пана Бога», займаліся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рабункам і разбоем [11, с. 383–384]. Пуціўльскі ваявода Пляшчэеў паведамляў расійскаму цару, што «копятца и идут многие мужики ис тех литовских городов к тем же самовольным казаком в сход, а иные, собравшися, побивают и грабят по дорогам ляхов и жидов» [14, с. 25].

Сучаснікі падзей адзначаюць жудасныя рэчы, якія рабілі азвярэлыя паўстанцы: «люди своевольные и пашенные мужики, побивъ пановъ своихъ въ ихъ маетностяхъ, а у панскихъ жонъ у беременныхъ брюха роспарывали и многое ругательство делали» [5, с. 227]. У Старадубе паўстанцы разам з казакамі забілі каля 1300 яўрэяў [7, с. 188]. Даходзіла да таго, што «склепи с трупами откоповали, мертвих тіла з гробов викидали и обдирали и в том одіню ходили» [2, с. 54]. «Казацкі тэрор» заспеў аднак не толькі прадстаўнікоў прывеліяванай часткі грамадства ВКЛ і яўрэяў, ён балюча ўдарыў і па саміх сялянах і мяшчанах. Саюзніцтва казакоў з татарамі прывяло да таго, што «многіе в неволю татарскую пойшли». На сабе адчулі гнеў казакоў і паўстанцаў «ремесники молодіе, которіе себі голови голили по-польску, чуприну пускаючи наверх голови» [2, с. 54]. Такім чынам, «казацкі тэрор», які панаваў на Палессі і ў Падняпроўі ўлетку 1648 г., так або інакш закрануў усе пласты грамадства ВКЛ і быў і па форме, і па змесце прыкладам палітыкі татальнага вынішчэння моўна і культурна асіміляванай рускай шляхты, часткі мяшчан і сялян, а таксама яўрэйскага насельніцтва.

Другім абліччам казацка-сялянскай вайны з’яўляецца «тэрор шляхецкі». Гэтая з’ява прыпадае на другі этап вайны і праяўляецца напрыканцы восені 1648 – у першай палове 1649 г. Наступленне войска ВКЛ на чале з Янушам Радзівілам паклала канец панаванню казакоў у Палессі. Літоўскае войска ў снежні 1648 г. увайшло ў Брэст, а пасля рушыла ў накірунку Пінск – Тураў – Мазыр – Бабруйск – Рэчыца, знішчаючы ўсё і ўсіх, хто быў звязаны з казакамі. Расійскі ганец дзяк Кунакоў паведамляе цару Аляксею Міхайлавічу, што «около Оршы, и Менска, и Новогродка, и Слонима и Брести Литовской на паляхъ многіе люди, а иные на колье четвертованые» [5, с. 297]. У Брэсце, пасля ўваходу ў горад шляхецкага войска «жолнери … и доостольное разоряютъ и поклажеевъ мещанскихъ и жидовскихъ ищутъ, и везде землю роютъ, и остальцовъ мещанъ и мещанскихъ детей изъ поклажеевъ мучатъи огнемъ жгутъ» [5, с. 297]. Такім чынам, жыхарам горада пасля казацкай стыхіі давялося адчуць на сабе яшчэ і лютасць раз’юшанай шляхты. Дорага заплацілі мяшчане Пінска за сваю падтрымку казакоў: «Пинескъ разорилъ стражникъ Литовской Мирскій и мещанъ побилъ больши 3000 ч. и женъ ихъ и детей велелъ побитъ безъ милости» [5, с. 297]. Пінск аказаўся настолькі разбураны, што яго ўладальнік канцлер ВКЛ Альбрэхт Станіслаў Радзівіл у чэрвені 1649 г. звярнуўся ў Галоўны Трыбунал ВКЛ з пратэстам на неапраўдана жорсткія дзеянні «Мірскага ерэтыка, рэгіментара войска». А.С. Радзівіл ацэньвае дэмаграфічныя страты ў Пінску ў 14 тыс. чалавек «маладых і старых» [15, s. 351]. Пакаранне Пінска стала прыкладам для іншых паўстаўшых гарадоў. Жорсткасць у Пінску не была выпадковай, а наўмыснай і мэтанакіраванай, што адзначалі ўжо сучаснікі. «Паколькі гэты горад быў адным з галоўных казацкіх прыстанішчаў, палякі для запалохвання іншых абрабавалі яго і пераўтварылі ў попел», – адзначае французскі вандроўнік П. Шэвалье [16, с. 99].

Пасля захопу войскам Я. Радзівіла Давыд-Гарадка ў мястэчку і наваколлі было пакарана смерцю рознымі прыёмамі 18 чалавек. Пры гэтым варта адзначыць, што пакаранню былі падвергнуты толькі тыя асобы, што супрацоўнічалі з казакамі. «Нявінных як у горадзе, так і ў воласці Давыд-Гарадзецкай усіх вызваліў і цэлымі пакінуў», - паведамляе аўтар [17, арк. 7]. У Тураве, тыя з мяшчан мяцежнага горада, якія падтрымалі паўстанцаў і не здолелі адступіць, паводле паведамлення самога Я. Радзівіла, усе былі «пад корань перабіты». Пасля штурму Мазыра захопленыя казакі і іх паплечнікі былі жорска пакараныя. Казацкі правадыр Міхненка трапіў у палон і быў пасаджаны на палю. Шляхціц Б.К. Маскевіч паведамляе: «Мы ж, калі заканчвалі пачатую перамогу, seклі і палілі дамы. Больш за іншых пры гэтым адзначыліся немцы, якія не шкадавалі не толькі саміх казакаў, але і жанчын і дзяцей, уцякаў хто мог, але не шмат хто з іх выратаваўся, … затым запалілі горад» [18, с. 434–435]. На падзеі ў Палессі рэзка адрэагаваў сам гетман Б. Хмяльніцкі. У лісце да Я. Радзівіла ён абураецца і не разумее, як польны гетман дазваляе сабе «людзей нявінных, хрысціян веры нашай … на палі саджаць і мардаваць» [19, с. 96–97]. У Чэрыкаве жаўнеры Радзівіла «казакаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

выбраўшы з паўтараста чалавек, адсеклі правыя рукі да запясця, а 50 чалавек на палі пасаджалі, а астатніх казакоў і іх жонак і дзяцей парубілі ўсіх» [20, с. 214]. У Лоеве адбылася падобная сітуацыя, тут шляхціцы бязлітасна «казакоў і іх жонак пасеклі ўсіх» [14, с. 39].

Сапраўды жаўнеры бязлітасна знішчалі ўсё звязанае з казацкай стыхіяй: «Литовскіе места отъ жолнерей погибли и развоеваны паче козаков», адзначае расійскі ганец [5, с. 399]. Цікава, што ўжо сучаснік падзей так адгукаецца аб дзеяннях шляхты: «пограбя мещанскіе животы и разоря ихъ совсемъ, на паля взбиваютъ и рубятъ без милости, даючи причину, будто они Речи Посполитой издрайцы, а Черкасомъ и гультайству доброхоты и съ ними одноверцы» [5, с. 296]. Такім чынам, старонні назіральнік ставіць дзеянні казакоў і шляхты ў адзіны шэраг. Жыхары Бабруйска, навучаныя прыкладам папярэдніх гарадоў, вырашалі не супраціўляцца Радзівілу і самі адкрылі брамы горада. Як паведамляе расійскі дзяк Кунакоў ахвярамі «шляхецкага тэрору» сталі больш за 1000 бабруйскіх мяшчан, з якіх 800 чалавек пазбавіліся рукі, 150-ці чалавекам былі сцяты галовы, 100 пасаджаны на палю. Разам з тым, сам Кунакоў не быў у Бабруйску, а непасрэдны відавочца «экзекуцыі» нямецкі храніст Й. Шледэр падае іншыя дадзеныя: «8 старшын пасаджаны на палі, каля 40 былі сцяты, былі адсечаны каля 270 правых рук [у мяцежнікаў – С.Ч.], пасля чаго астатніх адпусцілі, каб яны маглі пайсці да сваіх братоў і распавесці пра тое, як жорстка робяць з падданымі, калі яны паўстаюць супраць улады» [21, с. 24]. Горад застаўся цэлы, жаўнер, які паспрабаваў адабраць у бабруйчанкі хустку, быў павешаны на браме ля яе хаты. Шляхецкі тэрор быў мэтанакіраваным, планамерным і наўмысна жорсткім. Я. Радзівіл сваёй тактыкай у Бабруйску жадаў паказаць мяшчанству паўстаўшых гарадоў Падняпроўя магчымы шлях супрацоўніцтва – разрыў мяшчанамі сувязяў з казакамі гарантаваў паўстаўшаму гораду магчымасць ўратавання. Шляхам жорсткіх мер, шляхам тэрору Я. Радзівіл у 1649 г. усталёўваў парадак на Русі.

Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. стала вынікам вялікіх супярэчнасцей, якія наспявалі ў грамадстве ВКЛ у першай палове XVII ст. Вастрыня праблем і немагчымасць іх вырашыць мірным шляхам, шляхам улічвання інтарэсаў усіх пластоў грамадства Рэчы Паспалітай надалі гэтай вайне такі жорсткі і бескампрамісны характар. Па сваёй форме, дзеянні паўстанцаў у ВКЛ вельмі нагадваюць дзеянні французскіх сялян падчас Жакерыі, хаця паміж абедзвюма падзеямі ляжыць адрэзак часу ў 300 гадоў. У адрозненне ад казакоў, якія пераследвалі дакладна пастаўленыя палітычныя мэты, якія стварылі моцную вайсковую арганізацыю, рускія паўстанцы у ВКЛ не выпрацавалі нейкай канкрэтнай праграмы дзеянняў, а ў якасці мэты паўставала аморфная ідэя знішчэння шляхты, яўрэяў і ўсяго таго, што было звязана з сацыяльным і этнаканфесійным прымусам. Шляхта, у сваю чаргу, шляхам тэрору імкнулася адпомсціць рускім сялянам і мяшчанам за іх падтрымку казакоў, за той жах, які яна адчула ўлетку 1648 г., за тое, што яна страціла ў гэты час. Паміж шляхтаю і сялянска-мяшчанскімі масамі ўтварылася прорва нянавісці адно да аднаго, што значна аслабіла ўнутраную моц Польска-Літоўскай дзяржавы і адыграла вялікую ролю ў падзеях наступных 50–60-х гг. XVII ст.

## Літаратура


1. Абецедарский, Л.С. Борьба белорусского народа за воссоединение Белоруссии с Россией в середине XVII века / Л.С. Абецедарский // Воссоединение Украины с Россией: сб. статей. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – 440 с.

2. Літопис Самовидця. – К. :Наукова думка, 1971. – 207 с.

3. Pamiętniki Łosia towarzysza chorągwi pancernej Władysława margrabi Myszkowskiego wojewody Krakowskiego, obiemujące wydarzenia od r. 1646 do 1667.– Kraków : Nakładem księgarni D.E. Friedlena, 1858.–120 s.

4. Piwarski, K. Opozycja litewska pod koniec XVII wieku / K. Piwarski // Pamiętnik V powszechnego zjazdu historyków polskich w Warszawie. – Lwów nakładem polskiego towarzystwa historzcznego, 1931. – S. 82–83.

5. Акты, относящіеся къ исторіи Южной и Западной Россіи, собранные и изданные Археографическою комиссіею. – СПб. : Въ тип. П.А. Кулиша, 1861. – Т. 3. – 604, 134, 22 с.

6. Тяготы времён. Хроника Мейера из Щебржешина // Еврейские хроники XVII столетия : (Эпоха «хмельничины»). – М.; Иерусалим: Гешарим, 1997. – 287 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

7. Сабботай Гакоген. Послание / Гакоген Сабботай // Еврейские хроники XVII столетия : (Эпоха «хмельничины»). – М.; Иерусалим: Гешарим, 1997. – 287 с.

8. Pamiętnik o wojnach kozackich za Chmielnickiego przez Nieznanego autora. Wydanie z rękopismu. – Wrocław : Nakładem Zygmunta Schlettera, 1842. – 144 s.

9. Пучина Бездонная. Хроника Натана Ноты Ганновера // Еврейские хроники XVII столетия : (Эпоха «хмельничины»). – М.; Иерусалим: Гешарим, 1997. – 287 с.

10. Исторический памятник о Пинске // Чтения общества истории и древностей Российских. – М., 1847. – Т. 5. – С. 33–35.

11. Собранiе древнихъ грамотъ и актовъ городовъ Минской губернiи, православныхъ монастырей, церквей и по разнымъ предметамъ. – Минскъ : Въ Губернской типографiи, 1848. – 402 с.

12. Документы об освободительной войне украинского народа 1648–1654 гг. – Киев : Наукова думка, 1965. – 825.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. – Воп. 6. – Спр. 4233. – Л. 569–672.

14. Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов: в 3 т. – Мн. : Изд-во Акадамии наук БССР, 1960. – Т. II. – 560 с.

15. Pamiętniki Albrychta Stanisława X. Radziwiłła kanclerza W. Litowskiego. Wydane z rękopismu przez Edwarda Raczyńskiego. – Poznań : u braci Scherków, 1889. – T. 2. – 490 s.

16. Шевальє, П. Історія війни козаків проти Польщі. З розвідкою про їхне походженя, країну, звичаї, спосіб правліня та релігію і другою розвідкою про перекопськіх татар / П. Шевальє ; Пер. з франц. вид. 1663 р. – Київ : Вид-во Акад. наук УРСР, 1966. – 199 с.

17. НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 899. – Арк. 7. – Ліст Я. Радзівіла аб пакаранні казакаў і паўстанцаў у Давыд-Гарадку і наваколлі (9 лют. 1649 г.).

18. Дневник Богуслава Машкевича. 1643–1649 // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси: вып. II. (первая половина XVII ст.) ; под ред. В. Антоновича. – Киев : Тип. Г.Т. Корчак-Новицкого, 1896. – С. 406–438.

19. Документи Богдана Хмельницького (1648–1657). – К. : Вид-во Акад. Наук УРСР,1961. – 740 с.

20. Воссоединение Украины с Россией. Документы и материалы: в 3-х т. – М. : Издат-во Акад.наук СССР, 1953. – Т. 2. – 559 с.

21. Уривки з німецької хроніки «Театр Європи» // Сіверянський літопис. – 1999. – № 2. – С. 24–31.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 03.01.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ